ПЫТАННІ ЖЫЛЛЁВАГА ЗАКАНАДАЎСТВА 3

ГАРАЧЫ ЛЁД. ЧЭМПІЯНАТ ЕЎРОПЫ 3



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 СТУДЗЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 16 (28883)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый КРУТОЙ, міністр эканомікі:

«Мінск прапануе абмеркаваць на першай сустрэчы беларуска-расійскай групы па інтэграцыі пытанні энергетыкі і падатковага манеўру. Гэта для нас сёння самыя важныя тэмы. Пакуль расійскія калегі з такімі ініцыятывамі не выходзілі, але я думаю, што на працягу найбліжэйшага месяца мы сустрэнемся, па меншай меры, па тых напрамках, якія з'яўляюцца на сёння найбольш вострымі. Беларуская частка групы пачала работу. Нашы галіновыя калегі цяпер сустракаюцца на розных пляцоўках і ў Маскве, і ў Мінску, праводзіцца рэвізія тых дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты ў папярэднія гады. Частка пытанняў абмяркоўваецца на ўзроўні Еўразійскай эканамічнай камісіі. Адпрацоўваюцца ўсе магчымыя ўвязкі, шурпатасці, якія ў нас існуюць».

БЕЛАКРЫЛАЯ МАРА

Святар з Чачэрска, настаяцель храма Праабражэння Гасподняга протаіерэй Георгій Шмідаў ужо дзясятак гадоў разводзіць паштовых галубоў. Праз сваё хобі прывучае дзяцей — а іх у святара дзевяць! — да беражлівага стаўлення да прыроды. Колькі іх — белакрылых птушак — у адмыслова пабудаванай галубятні, айцец Георгій дакладна не ведае. Яго гадаванцы ўпрыгожваюць сваім палётам выпускныя званкі ў гарадской гімназіі, дзе вучацца ягоныя сыны і дочкі.

— З дзяцінства любіў займацца гэтымі птушкамі, але сваю мару — мець вялікую сям'ю пародзістых галубоў — ажыццявіў толькі ў сталым узросце, — кажа Георгій Міхайлавіч. — Спадзяюся, што і сын Арыстарх *(на фота)*, і іншыя сыны падтрымаюць і працягнуць маё крылатае захапленне.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КОРАТКА

- **Намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў снежні 2018 года склала Br1115,3.**
- У Беларусі пры мясцовых органах на пастаяннай аснове будуць працаваць рабочыя групы па навядзенні парадку на будаўнічых пляцоўках.

- **У Мінску з пачатку зімы на апрацоўку дарог было выдаткавана 31 тыс. тон пясчана-саляной сумесі і каля 30 тыс. тон галіту маркі А.**

ISSN 1990 - 763X

Імя салдата

Вялікая Айчынная вайна скончылася болей чым 70 гадоў таму, але шмат чаго яшчэ пра яе мы не ведаем. Застаюцца невядомымі сотні тысяч імёнаў салдат і камандзіраў Чырвонай Арміі, якія не вярнуліся з фронту. Але існуюць людзі, якія па крупінках аднаўляюць трагічныя падзеі тых часоў. Яны, «ваенныя археолагі», застаюцца на перадавой, праз іх мы трымаем сувязь з нашымі роднымі, якія засталіся на палях бітвы. Новы праект «Звязды» пазнаёміць з героямі, якія сёння вяртаюцца з вайны, адкрые новыя імёны і прасочыць лёс іх уладальнікаў...

МЁРТВЫЯ І ЖЫВЫЯ

Пазычыць назву ў Канстанціна Сіманава для першага артыкула вырашыла не выпадкова. Героі яго рамана паўтарылі лёс мужных абаронцаў Магілёва. З акружэння ўдалося выйсці нямногім, большасць засталася ляжаць у безыменных магілах — іх вельмі шмат на Магілёўшчыне.

Вызваленне вобласці было не менш цяжкім і крывавым. Кожны год на месцах былых баёў працуюць Вахты памяці, арганізаваныя сіламі абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага атрада «Віккру» (ад лацінскага «Victoria civenta» — «Перамога, заваяваная крывёй»). Цяпер гэта адзінае афіцыйна зарэгістраванае на тэрыторыі краіны такое аб'яднанне. У 16 раёнах вобласці дзейнічаюць дваццаць яго атрадаў і груп. Штогод па выніках пошукавых работ аб'яднання выпускаецца часопіс «Магілёўскі пошукавы веснік», дзе друкуюцца апошнія звесткі з архіўных крыніц і экспедыцый. Гэта выданне існуе дзякуючы падтрымцы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама. Стваральнікам і натхняльнікам атрада з'яўляецца Мікалай Барысенка, неабыякавы чалавек, які аддаў пошукавай справе 25 гадоў свайго жыцця.

СТАР. 4

Камунальныя стасункі

ШТО СЁЛЕТА ЗМЕНІЦЦА Ў КАПРАМОНЦЕ

Лоджыя замест балкона, электрыка ўзамен печы і газавай калонкі

Планавацца, праводзіцца і фінансавацца капрамонт сёлета будзе па-новаму. Дзяржпраграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» запланавана капітальна адрамантаваць 3,2 млн м² жылля. Гэта прыкладна 2,9 % ад усяго жылфонду краіны. У дамах можна будзе, напрыклад, наладжваць сістэмы дыстанцыйнага здымання паказчыкаў з прыбораў індывідуальнага ўліку расходу вады, газу, цяпла, а балконы — пераўтвараць у лоджыі, калі папярэднюю канструкцыю тэхнічна немагчыма або нязручна адрамантаваць.

Работ больш, тарыфы — ранейшыя

Пастановай Саўміна пашыраны пералік работ, якія будуць выконвацца за кошт мясцовага бюджэту і адлічэнняў на капрамонт грамадзян. Акрамя ўжо існуючых, сюды далучаць, напрыклад, магчымасць уладкавання рэцыркуляцыі ўнутрыдамавой сістэмы гарачага водазабеспячэння, што зробіць гэтую паслугу больш якаснай. Не прыйдзецца доўгі час зліваць ваду, пакуль яна стане гарачай.



СТАР. 4